Літаратурныя сустрэчы

# Адзіны народ

**У абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна прайшла літаратурна-музычная сустрэча з творчым актывам Прыдняпроўскага краю «Хай мацнее штогод наш адзіны народ», прысвечаная Дню народнага адзінства.**

На мерапрыемства сабраліся пісьменнікі з усіх куткоў Магілёўшчыны: Магілёва, Горак, Клічава, Касцюковіч, усе яны – члены Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

– Гістарычная справядлівасць для нас, беларусаў, заключаецца ў тым, што пасля 17 верасня 1939 года мы зноў можам жыць як адзіны народ на сваёй зямлі. Дзень народнага адзінства – гэта добрае свята. Сапраўды гістарычнае. Вельмі добра, што яно зараз у нас ёсць, – адзначыла паэтка Валянціна Габрусева.

Ва ўрачыстай абстаноўцы член савета Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Кунцэвіч уручыў Галіне Пярун і Алесі Цэван членскія білеты самага буйнога творчага аб'яднання літаратараў краіны, пажадаў таленавітым паэтам простага чалавечага шчасця і здароўя, а таксама новых кніг і сустрэч з чытачом.

Галіна Сяргееўна і Алеся Дзмітрыеўна сказалі самыя цёплыя словы ўдзячнасці арганізатарам за такі шчодры падарунак, які яны атрымалі напярэдадні Дня народнага адзінства.

– Для мяне гэта вельмі важная падзея, – адзначыла горацкая паэтка Алеся Цэван. – Я шчаслівая, што мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў маёй краіны – гэта важны крок у пісьменніцкай дзейнасці. Атрымаць прызнанне прафесіяналаў важна для любога творчага чалавека.

Літаратары Прыдняпроўскага краю Валянціна Габрусева, Галіна Пярун, Алена Кісель, Вольга Бялова, Аляксандр Косцераў, Алеся Цэван, Віктар Кунцэвіч чыталі свае вершы, а студэнты МДУ імя А.А.Куляшова прадэкламавалі вершы Алеся Казекі і Уладзіміра Ясева. Не засталіся ў баку і ўдзельнікі ўніверсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Натхненне», якія зачыталі вершы Наталлі Міхальчук. А выхаванцы ўзорнай тэатральнай студыі «У кропку!», Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў №1 таксама падрыхтавалі для гасцей творчыя нумары.

**Дар'я ЭВЕРС.**
*Фота аўтара.*



Здымак на памяць аб сустрэчы.





Галіна Пярун і Алеся Цэван.



Цудоўны мір кніг.


сердечно поздравляет всех

с Днем народного единства!



*Желаем стать крепче духом, обрести новую силу, поверить в свою удачу и не жалеть сил для общего дела. Пусть процветает наша страна, пусть народ наш живет счастливой, мирной, полноценной жизнью. Крепкого здоровья, счастья и благополучия!*